ДУК “ПІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА”
АДДЗЕЛ АБСЛУГОЎВАННЯ І ІНФАРМАЦЫІ
СЕКТАР КРАЯЗНАЎСТВА

# Краязнаўчы каляндар




**Пінск, 2015**

## *У 2016 годзе спаўняецца:*

**775** гадоў з часу перанясення епіскапскай кафедры **ПІНСКАЙ ЕПАРХІІ БЕЛАРУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ (БЕЛАРУСКАГА ЭКЗАРХАТА МАСКОЎСКАГА ПАТРЫЯРХАТА)** з Турава ў Пінск (Брэсцкая вобл.; 1241)

**445** гадоў з часу ўпамінання ў пісьмовых крыніцах **АПТЭКІ, ПЕРШАЙ НА БЕЛАРУСІ** (Пінск; 1561)

**95** гадоў з часу адкрыцця **ДЗЯРЖАЎНАЙ ГІМНАЗІІ ў г. Пінску** (1921)

**90** гадоў з часу адкрыцця **ПОЛЬСКАЙ МУЖЧЫНСКАЙ ГІМНАЗІІ** пры духоўнай семінарыі ў г. Пінску (1926)

**70** гадоў з часу стварэння **ПІНСКАЙ ФАБРЫКІ МАСТАЦКІХ ВЫРАБАЎ «КРЫНІЦА ПАЛЕССЯ»**, рэспубліканскага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства (Пінск; 1946)

**70** гадоў з часу стварэння **ПІНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АГРАРНА-ТЭХНІЧНАГА КАЛЕДЖА ІМЯ А. Я. КЛЯШЧОВА** (Пінск; 1946)

**60** гадоў з часу заснавання **ПІНСКАГА ДОСЛЕДНА-МЕХАНІЧНАГА ЗАВОДА**, ААТ, прадпрыемства па вытворчасці станкоў, механізмаў, насосаў, металаформаў і інш. вырабаў (Пінск; 1956)

# *Студзень*

**2** 80 гадоў з дня нараджэння **АНТОНА РЫГОРАВІЧА НАВУМАЎЦА** (1936, Пінскі р-н), украінскага вучонага-фізіка, акадэміка НАН Украіны, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Украіны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1988) і Украіны (1997)

**4 ці 16** 190 гадоў з дня нараджэння **РАМУАЛЬДА ЛЮДВІКАВІЧА ТРАЎГУТА** (1826, Камянецкі р-н – 1864), ваеннага дзеяча, генерала, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Польшчы

**12** **435 гадоў** з часу атрымання **г. ПІНСКАМ граматы на Магдэбургскае права** (1581)

# *Люты*

**12** **270** гадоў з дня нараджэння **АНДРЭЯ ТАДЭВУША БАНАВЕНТУРЫ** КАСЦЮШКІ (ахрышчаны 12.02.1746, Івацэвіцкі р-н – 1817), дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Рэчы Паспалітай, генерал-лейтэнанта, кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. у Польшчы, Беларусі і Літве, удзельніка вайны за незалежнасць ЗША

# *Сакавік*

**26** 80 гадоў з дня нараджэння **ВЯЧАСЛАВА ІВАНАВІЧА БАЦЮШКО** (1936, Пінскі р-н), вучонага ў галіне будаўнічай вытворчасці, выдатніка ваеннага будаўніцтва, выдатніка вышэйшай школы СССР, педагога

# *Красавік*

5 10 гадоў з часу стварэння **ПАЛЕСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА** ў выніку рэарганізацыі Пінскага дзяржаўнага вышэйшага банкаўскага каледжа Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (Пінск; 2006)

**6** 70 гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ МІХАЙЛАЎНЫ КОЎТУН** (1946, Рэчыцкі р-н – 2011), пісьменніцы, крытыка, даследчыцы, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1986)

## *Май*

**30** 65 гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ МІХАЙЛАВІЧА ХВІСЕВІЧА** (1951, Пінскі р-н), мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, афарміцеля, жывапісца

## *Чэрвень*

**26** 75 гадоў з пачатку дзейнасці **ПЕРШАГА НА БЕЛАРУСІ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА** пад кіраўніцтвам В. З. Каржа (Пінск; 1941)

## *Ліпень*

1 90 гадоў з часу адкрыцця першай экспазіцыі **МУЗЕЯ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ** (Пінск; 1926)

**1** 75 гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА РУМАКА** (1941, Пінскі р-н – 1995), вучонага ў галіне мікраэлектронікі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984)

## *Жнівень*

**6** 70 гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ ІВАНАЎНЫ ЛОКУН** (1946, Пінскі р-н), паэткі, літаратуразнаўца, лаўрэата прэміі Прэзідэнтаў акадэміі навук Украіны, Беларусі і Малдовы (2004), двойчы лаўрэата прэміі часопіса «Полымя» (1993, 2001), уладальніка медаля Святой Ефрасінні Полацкай (2006)

**13** 85 гадоў з дня нараджэння **Алеся Бібіцкага** (1931, Гомельская вобл. – 1998), мясцовага паэта (Пінск), члена Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**14** 80 гадоў з дня нараджэння **ІВАНА СЦЯПАНАВІЧА ШПАКОЎСКАГА** (1936, Пінскі р-н), літаратуразнаўца, крытыка

**15** 80 гадоў з часу правядзення **ПЕРШАГА ПАЛЕСКАГА КІРМАШУ** (Пінск; 1936)

**28** 75 гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА КАНСТАНЦІНАВІЧА НЕДЗЬВЕДЗЯ** (1941, г. Пінск), вучонага ў галіне паталагічнай анатоміі, выдатніка аховы здароўя

## *Верасень*

**85** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ФЁДАРАВІЧА ЛЫСЕНКІ (**1931, Полацкі р-н), вучонага ў галіне археалогіі, па матэрыялах даследаванняў якога створаны археалагічныя музеі «Бярэсце» і «Старажытны Тураў», лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002), ганаровага грамадзяніна г. Пінска

## *Лістапад*

**11** 105 гадоў з дня нараджэння **Архіепіскапа Брэсцкага і Кобрынскага Канстанціна (Хоміча)** (1911, Пінскі р-н – 2000).

**16** 100 гадоў з дня нараджэння **ЗІНОВІЯ МАРКАВІЧА ВАГЕРА** (1916, г. Тураў – 2004), паэта

**23** 110 гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ГЕОРГІЕВІЧА ШУБІТЫДЗЕ** (1906, Грузія – 1978), аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Пінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну

## *Снежань*

**21** 120 гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА КАНСТАНЦІНАВІЧА РАКАСОЎСКАГА** (1896 – 1968), савецкага ваеннага дзеяча, удзельніка Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Маршала Савецкага Саюза і Польшчы, Героя Савецкага Саюза (1944, 1945), узнагароджанага ордэнам «Перамога», сямю ордэнамі Леніна

Складальнік: Баговіч Т.К.,
галоўны бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦБ
Лістапад, 2015.